

# Сяргей Харэўскі

мастацтвазнаўца, культуролаг, гісторык архітэктуры. Скончыў Санкт-Пецярбургскі акадэмічны інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна. Цяпер – выкладчык ЕГУ. Навуковыя зацікаўленасці: Беларусь у кантэксце гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, гісторыя мастацтва і архітэктуры Беларусі, станаўленне гарадской цывілізацыі ў Беларусі.

Фота Ганны Голуб

# Незваротнае: ідэі і практыкі захавання гістарычнага цэнтра Мінска ў 1980-х гадах

## Irreversible: Ideas and Practices of Preserving the Historical Center of Minsk in the 1980s

**Сяргей Харэўскі**

The article by renowned art historian and EHU lecturer Siarhej Chareuski, is dedicated to the history of the restoration movement in Minsk in the 1980s. The author demonstrates how, by the end of the 1970s, there was a growing understanding of the value of urban structures and a change in attitudes towards it. Due to a lack of experience, Belarusian architects and restorers effectively created a new, romantic image of Minsk. Their ideas gained particular popularity among artists and poets, intensifying the public nostalgia for the "Old Mensk". The 1990s and the actual practices of restoration work shattered illusions and revealed the utopian nature of public expectations.

Эпоха 1980-х гадоў, на тле палітычных і культурных пераменаў у СССР, спарадзіла новы дыскурс у стаўленні да спадчыны ў Беларусі. Перадусім – у сталіцы. У грамадстве паўстала цалкам пазітыўная, збудаваная на новым каштоўнасным падыходзе, тэндэнцыя на ўмацаванне лакальнай ідэнтычнасці як апірышча нацыянальнай. Самай відавочнай падставаю для таго было вывучэнне, захаванне і развіццё гістарычнага цэнтра Мінска. Гэты запыт грамадства на той момант супаў з палітычным курсам уладаў нават у агульнасавецкім кантэксце. Знаёмства спецыялістаў СССР і асобна БССР з самымі важнымі міжнароднымі дамовамі і дакументамі, што вызначаюць і рэгламентуюць прынцыпы захавання архітэктурнай спадчыны – Венецыянскай (1964), Вашынгтонскай (1987) і Лазанскай (1989) хартыямі, хоць і мала што змяніла ў тутэйшай практыцы, але ж паставіла новыя задачы перад уладамі і праектантамі. Гэтыя дакументы абавязкова ўлічваліся пры стварэнні тагачасных праектных прапановаў, датычных гістарычных цэнтраў і паасобных помнікаў.

Яшчэ ў 1970-я гады, згодна з пастановай прэзідыума Цэнтральнай рады Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ад 27 красавіка 1972 года «Аб вызначэньні архітэктурнай і горадабудаўнічай спадчыны ў старажытных гарадах БССР», Палітэхнічны інстытут заняўся вызначэннем архітэктурнай і горадабудаўнічай спадчыны Мінска ды іншых гарадоў. Упершыню былі прапанаваныя межы ахоўных зон у гістарычным цэнтры сталіцы. На жаль, тады справа скончылася толькі падрыхтоўкай дэкларатыўных рэкамендацый. Але ў лютым 1979 года, пасля многіх непапраўных страт, ансамбль Верхняга гораду быў-такі ўзяты пад афіцыйную дзяржаўную ахову, і ў сакавіку 1980 года бюро Мінскага гаркаму КПБ і Мінгарвыканкам прынялі пастанову «Пра рэканструкцыю гістарычнай часткі Мінска». У 1981 годзе ўвесь гістарычны цэнтр Мінска быў уключаны ў афіцыйны спіс помнікаў гісторыі і культуры «ўсесаюзнага значэння».

На справе, межы ахоўных зон гістарычнага цэнтра Мінска ўвесь час змяняліся ў залежнасці ад патрэбаў будаўніцтва аб'ектаў ці развіцця транспартнай інфрастуктуры.

Красамоўным узорам стаўлення да гэтых зон у Мінску стала Пастанова Савета міністраў БССР № 369 ад 13 снежня 1982 года Аб Мінскім замчышчы:

> Улічваючы асаблівую гістарычную і археалагічную каштоўнасць тэрыторыі Мінскага замчышча і ў мэтах забеспячэння яе аховы і даследавання (…) Дазволіць частковае размяшчэнне на тэрыторыі Мінскага замчышча станцыі метрапалітэна «Няміга», перагонных тунэляў і інжынерных сетак у адпаведнасці з зацверджанымі праектамі (…) Прызнаць страціўшай сілу пастанову Савета Міністраў БССР ад 30 чэрвеня 1950 года № 799.

То бок, ліквідавалі ахоўны статус тэрыторыі колішянга замчышча, не зважаючы на яго «асаблівую гістарычную і археалагічную каштоўнасць». Проста ў валы, у браму колішняга замка, урэзалі станцыю метро [1]. Таму гісторыя стварэння ахоўных зон гісторыка-культурных каштоўнасцяў на пачатку мела выключна тэарэтычную каштоўнасць [2].

## Рамантычны перыяд

Першыя спробы маштабных рэстаўрацыйных работ у Мінску былі зробленыя ў пачатку 1970-х гадоў. Напрыклад, у 1975 годзе ў Чырвоным касцёле пасля рэканструкцыі размясціўся Дом кіно. Гэты прыклад спарадзіў надзеі, што неўзабаве ўвасобіліся ў новых праектах. Гэтак, у 1972–79 гадах быў часткова адрэстаўраваны знешні выгляд сабора Пятра і Паўла на Нямізе (архітэктар Алена Курто) з аднаўленнем аблічча храма ў духу ранняга барока на падставе акварэлі мастака Дз. Струкава 1864 года. Яшчэ адзін яскравы прыклад – вонкавая рэстаўрацыя былога касцёла Св. Язэпа, аб'яўленага помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння ў 1983 годзе. Тады, паводле праекта Генадзя Босака, будынак быў накрыты дахоўкай, а на фасадзе быў пастаўлены шчыпец паводле ўзора франтона базыліянскай царквы ў Барунах. Інтэр'ер тым часам застаўся ранейшы – як і ў вышэйпамянёным Петрапаўлаўскім саборы, ён быў падзелены пад патрэбы архіваў у пачатку 1960-х гадоў бетоннымі плітамі на пяць паверхаў.

Праектанты, даўшы волю марам, працавалі над ансамблем Траецкага прадмесця. Частка прадмесця была рэканструявана, што стала першай у Беларусі спробай комплекснай рэгенерацыі гістарычнай забудовы. Вядомыя архітэктары Леанід Левін і Юрый Градаў, якія не мелі папярэдняга досведа працы з гістарычнай архітэктурай, разам з архітэктарам-рэстаўратарам Сяргеем Багласавым, вынайшлі свой рэпрэзентатыўны ідэалізаваны вобраз старасвецкага прадмесця.



Мінск, Гандлёвыя рады ля Бернардынскага касцёла, 1987–1992 гг. Фота Сяргея Багласава

Пры гэтым падчас правядзення работ у 1982–1985 гадах была знішчана частка гістарычнай забудовы ўздоўж Камунальнай набярэжнай, разбураны аўтэнтычныя канструкцыі ў астатніх будынках, страчаны шматлікія элементы дэкору і гістарычныя артэфакты. Адначасова поспехам рэстаўратараў стаў новы воблік Камунальнай набярэжнай, узнятыя дахі і высокія франтоны, што апелююць да больш ранніх эпох. І менавіта ў гэтым рамантызаваным выглядзе Траецкае прадмесце стала аб'ектам творчасці для мастакоў і літаратараў, якія прысвяцілі яму багата твораў.

Той жа перыяд характарызаваўся публічнасцю абмеркавання праектных прапаноў па рэстаўрацыі і рэгенерацыі гістарычнага цэнтра. Праекты і макеты выстаўляліся ў фае Саюза архітэктараў Беларусі, у крытым катку ў парку Горкага, а таксама ў Рэспубліканскім Палацы прафсаюзаў. Тамсама, у Палацы прафсаюзаў і ў Галоўным архітэктурна-планіровачным упраўленні Мінгарвыканкама ў 1985 годзе адбыліся публічныя дыскусіі аўтараў праектаў з удзелам Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і прадстаўнікоў грамадства, перадусім творчай інтэлігенцыі і студэнцтва. Усё гэта асвятляла

рэспубліканская і гарадская прэса. Публікацыі выклікалі жывую зваротную сувязь [3]. Публічнае абмеркаванне праектаў рэгенерацыі Верхняга горада напярэдадні гарбачоўскай Перабудовы стала адной з самых рэзанансных падзей свайго часу. У выніку рашэнне пра рэгенерацыю старога Мінска было прынятае ва ўмовах публічнага конкурса праектаў і грамадскага кансэнсуса. Сам факт такіх абмеркаванняў надаваў гэтым праектам выключную ролю ў жыцці сталіцы і Беларусі ў цэлым.

Гэта тэндэнцыя была падхоплена гісторыкамі, краязнаўцамі ды публіцыстамі, якія транслявалі ідэю канструявання нацыянальнай ідэнтычнасці праз патэнцыял архітэктурнай спадчыны. Уладзімір Дзянісаў, напрыклад, завяршаў сваю кнігу Площадь Свободы в Минске на аптымістычнай ноце:

> Хотя комплексные реставрационные работы начнутся только в следующей пятилетке, уже сейчас ведется реставрация и благоустройство ряда памятников архитектуры площади Свободы – костелов бернардинских монастырей, торговых рядов, бывшего костела иезуитов. Станет близкой и зримой далекая история города. Оживут, прояснятся стершиеся от времени ее черты – выразительные и неповторимые, которые воссоздадут облик древнего Минска, стоящего на пороге своего тысячелетия [4].

Тэкст аўтара дапаўняўся фатаздымкамі праектаў рэстаўрацыі і рэгенерацыі Верхняга горада.

Адначасова мастацтвазнаўца і археолаг Зянон Пазняк у сваёй папулярнай кнізе Рэха даўняга часу падсумоўваў:

> Заканамерна нарадзіўся рух за ахову і захаванне культурнай спадчыны, узмацняюцца ідэі аб адраджэнні і аднаўленні страчаных помнікаў дойлідства. Цяпер мы перажываем час, калі гэтыя ідэі становяцца рэальнасцю. Недалёкі той дзень, калі старадаўні «Мінск наш кругом весяленькі», як пісаў яшчэ В. Дунін-Марцінкевіч, зайграе аднoўленымі барочнымі вежамі і мураванкамі, і паўстануць у бронзе і камені вялікія людзі Мінскай зямлі – Вінцук Дунін-Марцінкевіч і Станіслаў Манюшка, Ян Дамель і Валенцій Ваньковіч, Янка Лучына і Карусь Каганец, Уладзіслаў Галубок і Альберт Паўловіч, Уладзімір Тэраўскі і Фларыян Ждановіч, Ядвігін Ш. і многія іншыя [5].

Гэтыя ідэі падхопліваліся грамадствам. Мастакі стварылі цэлую галерэю вобразаў старасвецкага, ідэальнага горада і ягоных пасобных аб’ектаў, такіх як сядзіба Ваньковіча (зруйнаваная ў 1979 годзе), Ратуша, вежа-званіца іезуіцкага калегіума ды іншыя. Свае творы гэтым тэмам прысвяцілі жывапісцы Леанід Шчамялёў, Уладзімір Тоўсцік, Фелікс Янушкевіч, Алесь Марачкін, графікі Мікола Купава, Уладзімір Басалыга, Яўген Кулік, архітэктар Віктар Сташчанюк ды многія іншыя. На гэтай жа хвалі паўстала моладзевае аб’яднанне «Талака», супольнікі якога бралі ўдзел у грамадзкіх слуханнях і дыскусіях, непасрэдна працавалі на аб’ектах у якасці валанцёраў. Але напрыканцы 1980-х гадоў грамадскія ініцыятывы сталі прадметам вострай палітычнай крытыкі з боку камуністычных уладаў, што імкнуліся ўсяляк абмежаваць дзейнасць нефармальнага руху за захаванне, папулярызацыю і развіццё спадчыны, бачучы ў ім пагрозу сваёй ідэалогіі [6]. І ўсё ж рэзанансныя публікацыі толькі пашыралі веды пра праблемы ў гэтай сферы і стваралі інфармацыйны фон, на тле якога пытанні рэстаўрацыі помнікаў і рэвіталізацыі гістарычных мясцін станавіліся аднымі з галоўных у культурным і палітычным жыцці Беларусі.

Тым часам у сярэдзіне 1980-х гадоў, натхнёныя першымі поспехамі, гісторыкі і рэстаўратары загаварылі пра магчымасьць узнаўлення такіх найважнейшых для горада аб’ектаў, як вежа-званіца кафедральнага касцёла, Ратуша і царква Святога Духа. Мала хто ў савецкія часы меў на тое надзею, але цяпер у грамадстве ўжо вілравалі адпаведныя

ідэі. З часам яны сталі супольнымі марамі. У газетах «Вячэрні Мінск», «Звязда», «Чырвоная змена» і «ЛіМ», а таксама ў часопісе «Строительство и архитектура Белоруссии» разгарнулася гарачая дыскусія пра перспектывы аднаўлення гістарычных цэнтраў і адбудовы страчаных аб'ектаў. Аднаўленне ўспрымалася як лагічны працяг гісторыі, як доўгачаканы этычны акт у кантэксце дэкаланізацыі.

Так паступова былі ўвасоблены ў жыццё неаторыя шматкроць абмеркаваныя праектныя прапановы 1980-х гадоў, якім папярэднічалі гады археалагічных раскопак і выспявання ў культурным кантэксце. Мары даўжынёй у чвэрць стагоддзя сталі рэчаіснасцю.

## Развітанне з утопіяй

Адначасова працягвалася і руйнаванне аб'ектаў, нават прызнаных гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі. У тыя ж гады былі знішчаны помнікі, фота якіх яшчэ нядаўна аздаблялі кнігі Уладзіміра Дзянісава і Зянона Пазняка: дыхтоўны трохпавярховы асабняк XVIII стагоддзя у духу ампіра на Інтэрнацыянальнай, будынак гарадскога тэатру, былая аптэка XVIII стагоддзя перад праваслаўным саборам і г. д. Ужо ў 1995 годзе быў цалкам зруйнаваны комплекс Малога гасцінага двара, унесены ва ўсе спісы помнікаў. Парадаксальна, але ён фігураваў нават у спісе 2009 года як гісторыка-культурная каштоўнасць рэспубліканскага значэння (рэшта падмуркаў) [7]. Пазней была амаль дашчэнту знішчана аўтэнтычная гістарычная забудова вуліц Гандлёвай (цяпер Зыбіцкая) і Герцэна.

Ігнараванне міжнародных дакументаў і нарматываў, фінансаванне паводле астаткавага прынцыпа, дагматызм у вызначэнні прыярытэтных накірункаў ахоўнай дзейнасці, супраціў грамадзянскім ініцыятывам, парушэнне правоў уласнасці жыхароў гістарычных дамоў і кварталаў фатальна адбілася на практыцыі захавання і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны. Пры гэтым дзяржава, як і ў часы сацыялізма, захавала поўную манаполію на гарадскую тэрыторыю і аб'екты спадчыны. Ахова, выкарыстанне і інтэрпрэтацыя гісторыка-культурнай спадчыны Мінска так і не стала справай грамадзянскай супольнасці. Адсутнасць кантролю з боку грамадства, ігнараванне дыялогу з незалежнай экспертнай супольнасцю і непразрыстая сістэма прыняцця рашэнняў спарадзіла мноства праблем у дадзенай сферы.

Такім чынам, дзве апісаныя вышэй узаемавыключныя тэндэнцыі захаваліся і да XXI стагоддзя. Знішчэнне гісторыка-культурнага ландшафта і натуральнага прыроднага асяроддзя прывяло да непапраўных хібаў. Сярод іншага – да страты археалагічных і архітэктурных помнікаў, скажэнне маштаба і характара гістарычнага цэнтру. Абвастрылася і праблема аўтамабільных паркавак па перыметры гістарычнага цэнтра.

Марнасць спадзеваў і высілкаў грамадства і экспертнай супольнасці па зберажэнні і развіцці гістарычнага цэнтра Мінска ўжо ў сярэдзіне 1990-х гадоў была прызнаная і самім чынавенствам з Міністэрства культуры. Вось што мусіў канстатаваць Ігар Чарняўскі, тагачасны намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Савеце Міністраў:

> Значную шкоду рэгенерацыі гарадскога асяроддзя наносіць гвалтоўная змена функцыянальнага прызначэння шэрагу будынкаў. Кварталы старога горада ператвараюцца ў «мёртвую зону», запоўненую офісамі і неабходнай для іх абслугоўвання атрыбутыкай [8].

Ідэя рэгенерацыі гістарычнага цэнтра сталіцы Беларусі як апірышча нацыянальнай ідэнтычнасці на грунце дасавецкай культурнай спадчыны – адна з найвялікшых утопіяў 1980-х гадоў. І, бадай, самая прыгожая ўтопія!




Мітынг у Мінску у абарону Верхняга горада, у цэнтры – Сяргей Харэўскі, 1988 г. Фатограф Вадзім Качан

Хоць яшчэ 23 студзеня 1989 года была прынята адмысловая пастанова Саўміна № 45 «Аб мерах па паскарэнні рэстаўрацыі і рэканструкцыі гістарычнай часткі Мінска», у кіраўніцтва БССР не хапіла палітычнай волі здзейсніць у поўным аб'ёме праектныя прапановы. Чаму? Бо не ставала таксама і разумення патрэбы ў гэтым, як не было яго і ў большасці жыхароў рэспублікі. Чаму замест будаўніцтва жылля трэба траціць рэсурсы на ідэалістычныя праекты?.. Эканамічны і палітычны крызіс канца 1980-х гадоў фактычна спыніў развіццё рэстаўрацыі ва ўсёй Беларусі і ў Мінску ў прыватнасці. Са зменай эканамічнай мадэлі і паўстаннем новых форм уласнасці шмат якія праектныя прапановы, разлічаныя на поўную манаполію дзяржавы і нерынкавыя формы рэгулявання эканомікі, аказаліся наогул нерэалістычнымі.

Практыкі наступных гадоў перанялі ўсе заганы савецкага часу, уключна з поўным ігнараваннем міжнародных методык і рэкамендацый. І ўжо на пачатку 2000-х гадоў справа аховы гісторыка-культурных каштоўнасцяў і рэгенерацыі гістарычнага цэнтра ў сталіцы набыла зусім некантралюемы характар у сітуацыі валюнтарыскага адміністратыўнага ціска, накіраванага на камерцыйныя інтарэсы вузкага кола інвестараў і бездапаможнасці грамадства, у тым ліку экспертнай супольнасці, чыё меркаванне дэманстратыўна ігнаруецца [9].

У выніку паўстаў зусім новы гістарычны цэнтр Мінска са сваім непаўторным абліччам, дзе вымыслены вобраз прэваліруе над рэчаіснасцю і гістарычнай дакументальнасцю [10]. Але вобраз Мінска цяпер ужо цалкам залежыць не ад законаў і меркавання экспертаў, а ад патрэбаў тых, хто гатовы інвеставаць у яго, несупынна інтэрпрэтуючы на свой густ. Бо за апошнія 40 гадоў аўтэнтычных помнікаў у ім ацалела толькі некалькі дзясяткаў, а гісторыка-культурны ландшафт зменены цалкам і незваротна.

## Выкарыстаная літаратура

[1] Харэўскі, С., Махнач, А. Кропкі незвароту, або пра які Менск можна марыць? // ARCHE. 2014. № 4. С. 79–97.
[2] Лаврецкая Н. Эволюция подхода при определении границ исторического центра (на примере Минска и Витебска) // Каштоўнасці мінуўшчыны – 6. Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння. Мінск: Знамение, 2003. С. 130–133.
[3] Письма в редакцию // Строительство и архитектура Белоруссии. 1988. №3. С. 18, С. 21.
[4] Денисов, В. Площадь Свободы в Минске. Минск: Полымя, 1985. С. 71.
[5] Пазняк, З. Рэха даўняга часу: Кніга для вучняў. Мінск: Нар. асвета, 1985. С. 124–125.
[6] Залесский, Б., Ильюшенко, Н. Позиция или поза? // Вечерний Минск. 26.03.1988, 05.04.1988; Левин, В., Тарасевич, Б. Пена на волне перестройки // Вечерний Минск. 27.10.1988; Соломонов, А. Старые ошибки в новых условиях // Знамя юности. 06.11.1988.
[7] Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: [Даведнік] / Склад. В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. Мінск: БЕЛТА, 2009.
[8] Чарняўскі, І. Рэгенерацыя забудовы гістарычнага цэнтра Менска ў кантэксце нацыянальнага і міжнароднага заканадаўстваў // Каштоўнасці мінуўшчыны – 1. Праблемы зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны Менска. Мінск: Лекцыя, 1998.
[9] Русаў, П. Захаванне гістарычнага асяродку вуліцы Няміга ў Мінску // Каштоўнасці мінуўшчыны – 6. Гістарычныя цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння. Мінск: Знамение, 2003. С. 87.
[10] Бубновский, Д. Исторический шанс исторического центра Минска // Архитектура и строительство. 2005. № 2 // http://ais.by/story/436 (12.04.2005).